Падпісацца на «Народную Волю» можна ў любы дзень
у любым паштовым аддзяленні ці ў спецыялізаваных пунктах «Белсаюздруку».

На простор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою.
Якуб КОЛАС

№ 83 (4335)

19 кастрычніка 2018 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

БЛІЦ

Паводле прагнозаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, пры існуючых тэндэнцыях у 2030 годзе на 1000 грамадзян працаздольнага ўзросту будзе прыходзіцца прыкладна 841 непрацаздольны чалавек (у 2010 годзе было 693).

Які лёс чакае пенсіянераў у будучыні?

Уладзімір КАВАЛКІН, эканаміст, кіраўнік праекта «Кошт урада»:

– Калі ўсё застанецца так, як яно ёсць сёння, то беларусы, якім сёння 40–50 гадоў, у старасці апынуцца ў жахлівым становішчы.

Але магчымы і іншыя варыянты развіцця сітуацыі.

Першы – калі будзе расці прадукцыйнасць працы на беларускіх прадпрыемствах, адпаведна зменшыцца колькасць працуючых, але ўзрастуць заробкі, павялічыцца сума падаткаў, што дазволіць утрымліваць пенсіянераў у рамках той салідарнай пенсіённай сістэмы, якая зараз існуе ў Беларусі. Аднак гэты шлях вымагае структурных рэформаў, на якія А.Лукашэнка пакуль не ідзе.

Другі шлях – гэта правядзенне пенсіённай рэформы, укараненне назапашвальнай пенсіённай сістэмы, але пра гэта гаворка сёння не вядзецца.

Сяргей КАЛЯКІН, лідар Беларускай партыі левых «Справядлівы свет»:

– Усе гэтыя размовы, што павялічваецца колькасць непрацуючых ў адносінах да працуючых, – пэўным чынам манкіраванне грамадскай свядомасцю. А давайце паглядзім, як вырасла за гэтыя гады прадукцыйнасць працы. А вырасла яна значна больш, чым гэтыя суадносіны, і тая частка, якую трэба аддаваць пенсіянерам, цалкам прымальная. Таму, на мой погляд, калі наша дзяржава будзе сапраўды клапаціцца пра старых і дзецей – грошай хопіць усім.

Надзея САЛАЎЁВА, індывідуальны прадпрымальнік, Магілёў:

– Нічога добрага не чакае, таму я, напрыклад, вывучаю магчымасці назапасіць самой на сваю пенсію і ўжо звярнулася ў страхавую кампанію. Разлікі такія: мне зараз 39 гадоў, калі пачну штомесяц адкладаць 50 рублёў, то, калі выйду на пенсію ў 58, буду дадаткова мець да гарантаванай дзяржавай пенсіі яшчэ каля 100 долараў.

Алена МАСЛЮКОВА, былая настаўніца, г.Светлагорск:

– Калі эканоміка будзе ў правале, то, думаю, нашы ўлады ўвесь час паступова будуць павялічваць пенсіённы ўзрост. І тады фактычна кожны беларус будзе працаваць да смерці, а не да пенсіі. Асабліва гэта тычыцца нашых мужчын, сярэдняя працягласць жыцця якіх 67 гадоў.

Ганна КОРЗУН, медыцынскі работнік, г.Слуцк:

– Чакае нас нярадаснае жыццё, і я, шчыра кажучы, не асабліва разлічваю на сваю будучую пенсію, бо яна і ў сённяшніх пенсіянераў такая, на якую не пражывеш, ну хіба толькі калі, акрамя лекаў, сціплай ежы і квартплаты, ніякіх трат больш няма. Таму для мяне галоўнае – гэта маё здароўе, каб былі сілы працаваць як мага даўжэй, таму што бессэнсоўна спадзявацца, што краіна за маю сумленную працу аддзячыць мяне ў старасці добрай пенсіяй.

Уладзімір КАЗЕКА, селянін, Драгічынскі раён Брэсцкай вобласці:

– Які лёс чакае пенсіянераў? Шчыра кажучы, мяне гэта не хвалюе. Я ўжо 20 гадоў працую на сябе і, адпаведна, на сваю будучую пенсію.

Але думаю, што нічога добрага беларускіх пенсіянераў не чакае, і мы самі ў гэтым вінаваты, бо нельга быць такімі інертнымі. Усё цярпім, таму так і жывём.

Марыя МАМАШУК, сярэбраны прызёр Алімпіяды-2016 па вольнай барацьбе, Гомель:

– Так далёка ў будучыню я не гляджу, вырашаю праблемы і задачы па меры іх паступлення. Зараз я працую, плачу падаткі, у тым ліку і ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва. З 1 студзеня нам, дарэчы, павысілі зарплату, сярэдняя па камандзе зараз 800–900 рублёў. Калі ёсць добры вынік, налічваецца стыпендыя. Акрамя таго, не ведаю, як усё складзецца пасля спорту, – можа, распачну сваю справу, а там даходы будуць іншыя. У любым выпадку, думаю, без пенсіі не застануся...

Юрый АЛЯКСЕВІЧ, кіроўца, Мінскі раён:

– Што нас чакае, не ведаю. Баюся, што да пенсіі не дажывём. На маёй вуліцы толькі сёлета пахавалі двух маладых мужчын, якім да 60 гадоў было ой як далёка. Таму нават і разважаць не хочацца пра будучую пенсію. Тут хоць бы дажыць, а ўжо потым будзем думаць аб тым, як выжываць.

Кацярына БАРНУКОВА, дырэктар Беларускага эканамічнага даследча-адукацыйнага цэнтра:

– Нас чакае далейшае павышэнне пенсіённага ўзросту, каб не дапусціць таго, што колькасць працуючых беларусаў зраўняецца з колькасцю непрацаздольных. Хутчэй за ўсё, спачатку паўторым расійскую рэформу і падоўжым пенсіённы ўзрост для жанчын да 60 гадоў, для мужчын – да 65, а потым паэтапна зраўняем гэты ўзрост для мужчын і жанчын.

Акрамя таго, трэба разумець, што з кожным годам пенсія ўсё больш будзе станавіцца падобнай на сціплую дапамогу па беднасці. І калі чалавек хоча годна жыць у старасці, то мусіць сам ужо сёння пра гэта паклапаціцца і пачаць самастойна назапашваць на сваю будучую пенсію.

Апытвала Марыя ЭЙСМАНТ.

ВЯЛІКАЯ ПАЛІТЫКА

Установка на развіццё нармальных адносін з Еўрапейскім Саюзам

Учора ў прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі адбылася рабочая сустрэча з міністрам замежных спраў Уладзімірам Макеем. Звяртае на сябе ўвагу наступнае выказванне галоўнага дыпламата краіны пасля гутаркі з першай асобай дзяржавы:

“Ёсць дакладная ўстаноўка кіраўніка дзяржавы адносна прадаўжэння курсу на развіццё нармальных адносін з Еўрапейскім Саюзам, у першую чаргу эканамічных, палітычных і гуманітарных”.

Што ж, здаровы сэнс падказвае, што нам, беларусам, ні ў якім выпадку нельга псаваць адносіны з нашымі заходнімі партнёрамі.

Раіса КАРАЛЬКОВА.

ГУЧНЫ ПРАЦЭС

Прысуд па «справе Коржыча» агучаць 5 лістапада

Пракурор запрасіў для сяржантаў, якія служылі ў навучальным цэнтры ў Печах, дзе ў кастрычніку мінулага года загінуў салдат тэрміновай службы **Аляксандр Коржыч**, розныя тэрміны пакарання: 9 гадоў для **Яўгена Бараноўскага**, 7 гадоў для **Антона Вяжэвіча** і 6 гадоў для **Ягора Скуратовіча**. Іх абвінавачваюць у атрыманні хабару (чч.1, 2 артыкула 430 КК РБ) і перавышэнні службовых паўнамоцтваў, якое прывяло да цяжкіх наступстваў (ч.3 артыкула 455 КК РБ). А Бараноўскага – яшчэ і ў крадзяжы (ч.1 арт.205).

ПАМЯЦЬ

«Курапаты павінны стаць месцам прымірэння беларусаў…»



У Курапатах поўным ходам ідзе падрыхтоўка да ўстаноўкі помніка-мемарыяла. Удзел у працах бяруць як прадстаўнікі ўлад, так і тыя, хто пратэстуе супраць месца ўсталявання помніка.

Аб тым, што там адбываецца, “Народнай Волі” распавёў ***Павел Севярынец.***

– Гэты тыдзень сапраўды адметны – у Курапатах нарэшце распачаліся падрыхтоўчыя работы для ўсталявання мемарыяла. Але ж грунт для ўладкавання дрэнажнай сістэмы першапачаткова планавалася здымаць бульдозерамі і экскаватарамі. Лічыце, збіраліся машынамі варочаць парэшткі людзей. Зразумела, пратэстоўцы выступілі супраць гэтага. Паразуменне было знойдзена, у выніку гэтыя работы праводзіліся ўручную, рыдлёўкамі. Разам працавалі як пратэстоўцы, так і прадстаўнікі дзяржавы.

– Месца для ўсталявання мемарыяла падрыхтавана?

– Улада выбрала месца на «Галгофе» – Курапацкай гары крыжоў. Там раскапаны катлаван памерам тры на тры метры. Дарэчы, падчас работ былі знойдзены гільзы, у тым ліку і ад НКВДэшных наганаў з маркіроўкай 1937–1938 гадоў…

Скажу шчыра: абаронцы Курапат лічаць, што месца, выбранае ўладамі, не зусім удалае. Там, на Курапацкай Галгофе, ужо ёсць цалкам сфарміраваная кампазіцыя з крыжоў і камянёў. У тым ліку і крыжа, які быў усталяваны ўладамі. Нас бянтэжыць тое, што рашэнне аб усталяванні мемарыяла на Галгофе прымалася без шырокага грамадскага абмеркавання. Мы выступаем за дыялог. Лісты з прапановай аб правядзенні “круглага стала” па гэтай тэме разасланы ў дзяржаўныя інстанцыі, якія маюць дачыненне да гэтага мемарыяла.

Мы, абаронцы Курапат, маем канкрэтную прапанову: на нашу думку, мемарыял павінен быць усталяваны на ўваходзе ва ўрочышча. Але пакуль працы вядуцца на «Галгофе». Мы, яшчэ раз кажу, супраць гэтага. Ці пачуюць нас ва ўладных кабінетах? Пакуль гэта пытанне адкрытае, але я шчыра перакананы, што Курапаты павінны стаць месцам прымірэння, а не разладу для беларусаў.

– Як праходзіць варта каля рэстарана “Поедем поедим?

– Па-ранейшаму штодзённа і безупынна. Здараюцца канфлікты паміж наведвальнікамі і абаронцамі. Бываюць і правакацыі. Але яўных канфліктаў, якія пацягнулі б за сабой пратаколы ці арышты, няма. На гэтым тыдні складзены толькі адзін пратакол – на Дзяніса Урбановіча.

На адной з апошніх нарад пратэстоўцаў прынята рашэнне: стаяць тут да Дзядоў. Нязменнай наша пазіцыя застаецца і ў пытанні перамоў паміж пратэстоўцамі і ўладальнікамі рэстарана: дыялог немагчымы, пакуль рэстаран працуе і прымае наведвальнікаў.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

МЕРКАВАННЕ

Зміцер ДАШКЕВІЧ: «Калі дзяржава ставіць памятны знак – гэта не блюзнерства»

Не перашкаджала дзяржава – і Глеб Лабадзенка з народнай падтрымкай паставіў першы ў Беларусі помнік Тадэвушу Касцюшку. Не ўстаўляюць ідэолагі саўка палкі ў колы – і Андрэй Кім запаланіў кінатэатры беларускай мовай. З другога боку, сунула дзяржава свой лыч – і няма шыльды ў гонар БНР. Зноў уціснула парсючыны пятак – разбурыла дзень вышыванкі. Завішчаў нехта ў пагонах – і няма заўзятараў на спартыўных трыбунах.

І вось цяпер мы назіраем, як падыходзіць да рэалізацыі ўстаноўка дзяржавай памятнага знака ў Курапатах. Форма, у якой наша дзяржавушка часта робіць тыя ці іншыя дзеянні, – ні з кім не раючыся, нахрапам, – абгрунтавана выклікае адмоўную рэакцыю арганізма. Але, апроч формы, ёсць змест – і нам трэба добра падумаць над тым, наколькі гэта сапраўды слушна, па змесце пратэставаць супраць дзяржаўнага мемарыяла ў Курапатах.

Дазволю сабе выказаць меркаванне. Асабіста я не бачу ніякіх лагічных і маральных аргументаў, якія дазволілі б нам супрацьстаяць устаноўцы памятнага знака ад дзяржавы.

Па-першае, сам памятны знак не самы горшы, які мог бы быць. Ну не ў РПЦэшную ж цыбуліну збіраюцца апрануць «Галгофу», але паставіць даволі сціплы звон. Што дрэннага ў ім ці такога ўжо непрыгожага?

Па-другое, мы так доўга абвінавачвалі пракамуністычную дзяржаву (і рабілі гэта слушна) за тое, што яна не ўшаноўвае Курапаты і памяць нявінна забітых камуністамі. Ну вось цяпер прыйшла ўшанаваць. Што зрабіць, калі дзяржавушка наша гэта робіць нязграбна? Іншага чакаць і не выпадала. Але ўсё ж пагодзімся: устаноўка памятнага знака – гэта не блюзнерства, як пабудаваны побач бульбашжор «Поедем поедим», але ўшанаванне Курапатаў.

Па-трэцяе, хіба дзяржава нешта бурыць з народнага мемарыяла? (А я лічу, гэта магла быць адзіная сапраўдная падстава, якая дазволіла б не толькі выходзіць на пратэст, але і заклікаць да пратэсту грамадства.) Не, не бурыць – пакуль у дзяржавы хапае розуму нічога не кранаць. І адказныя за работы людзі публічна абяцаюць, што нічога кранута не будзе.

Магчыма, нехта лічыць, што мае права казаць: тут не рабіце, а рабіце тут; вы не ўшаноўвайце, а вы шануйце. Ну, хто так лічыць, няхай робіць. Але я мяркую, гэта і не вельмі слушна, і не вельмі лагічна. Вядома, нам бы хацелася ўсё і адразу: і каб архівы адкрылі, і каб ідалаў савецкіх скінулі, і каб злачынцы былі названы злачынцамі, і каб тое, што робіцца ў Курапатах, рабілася шчыра і без кан'юнктуры.

І ці не ў падобнай сітуацыі быў апостал Павел, які дзве тысячы гадоў таму пісаў, што некаторыя з любові прапаведуюць Ісуса Хрыста, а некаторыя – праз зайздрасць, каб павялічыць цяжар Паўлавых путаў. І ўсклікаў: “І што з гэтага? Усякім чынам, ці дзеля віду, ці праўдзіва, але Хрыстос прапаведуецца, і я з гэтага радуюся і буду радавацца” (Піліпцам, 1). Дык паслухайце, сябры, мы не круцейшыя за чалавека, тэкстамі якога напоўнена ледзь не палова Новага Запавету.

Некаторыя з любові змагаюцца за Курапаты, другія – з зайздрасці, а трэція – каб павялічыць цяжар нашых путаў. І што з гэтага? Я мяркую, нічога. Бо ўсякім чынам: ці дзеля віду, ці праўдзіва, але праўда пра Курапаты прапаведуецца. Гэтаму давайце радавацца.

(svaboda.org)

ТОЧКА ЗРЕНИЯ



Александр ФЕДУТА

Плач младенца

17 октября в Бобруйске в кустах был обнаружен новорожденный младенец. Он плакал. Обнаружила его бригада «скорой помощи», так что есть надежда, что ребенок выживет. И следователи тоже занимаются этим вопросом. Вероятно, скоро мы узнаем, что к чему.

Но я сейчас не об этом ребенке. Я вообще о белорусских детях.

Кажется, сколько лет прошло с тех пор, как депутат Ольга Абрамова (а сколько лет она уже и не депутат) подняла вопрос о необходимости ввести в правительстве должность уполномоченного по правам ребенка. Весь мир признает, что детей нужно не только рожать, но и беречь, не только воспитывать, но и защищать. Защищать от насилия, от неумных и зачастую не отдающих себе отчета в сути своих действий, сильно пьющих родителей. Защищать иной раз от них же самих. От соблазнов, идущих с экрана телевизора и из интернета. От друзей, уговаривающих курнуть за углом школы. От раннего взросления и от затянувшегося инфантилизма.

У нас никак не могут сократить число идеологов. Сократите! Вы же сами признаете, что государственной идеологии нет и что вся эта идеологическая «великая армада» не может ее придумать! Но если они действительно бесполезны, сократите сто идеологов, введите двадцать ставок – на уровне страны и в регионах по уполномоченному с ограниченным числом помощников. Это ведь просто.

Нет. Это не просто. Например, стоило едва заикнуться о необходимости ограничения домашнего насилия, как раздались возгласы из высокопоставленных кабинетов:

– Да как же это? Да это ведь против наших национальных традиций! Меня с ремнем воспитывали, и я своих детей лупил. Посмотрите, какие красавцы вымахали!

Взгляд у «красавцев» затравленный и перепуганный. Но кто же смотрит ребенку в глаза? Это лишнее. Спускай штаны, подставляй задницу, мы сейчас с удовольствием займемся твоим воспитанием!

Понимание ценности собственной личности закладывается у ребенка с детства. Когда тебя бьют, из тебя автоматически выбивают это понимание. Взрослый – он ведь прав по определению, он может то, чего не можешь ты. А значит, когда он унижает тебя, доставляет тебе боль, это вполне естественно.

Помню, как Белорусское телевидение вело репортаж с одной из новогодних елок. Дети приветствовали высокого гостя так, как могли, – тонкими голосами, по-детски же протягивая слова:

– Здра-стуй-те…

– А кто это тут пищит? – радостно улыбаясь, вопросил гость. – Крысы или мыши?

Других слов не нашлось. То есть в кармане в виде официально заготовленной речи, разумеется, они лежали. Но хотелось в тот момент чего-то менее формального. И гость это чувствовал. Вот неформальное-то и поперло вовсю.

Это – отношение к детям. За него никому и ничего не будет.

Я помню скандальную ситуацию с солигорским школьником Ваней Шило, которому не дали получить аттестат. По политическим мотивам, кстати. И хотя сделано это было с очевидным давлением на школу – двое членов администрации школы даже в знак протеста ушли в отставку – и с очевидным же нарушением этических и правовых норм, никому за это ничего не было. И ребенку не было к кому обратиться. Кому пожалуешься на высокопоставленную тетеньку из управления образования? Некому жаловаться. Нет человека, который обязан тебя выслушать и защитить.

Впрочем, думаю, никто и не стал бы слушать и защищать. Ты ведь ребенок. Скажи спасибо, что не плачешь в кустах.

Да и без этого – без политики – есть от кого защищать детей. Помните, было громкое дело педофила Давыдовича, бывшего сотрудника Администрации президента? Со скрипом, с проволочками осудили. Приговор вынесли в декабре 2016 года. Осудили на пять лет. Вероятно, за хорошее поведение (он ведь умеет себя хорошо вести, правда?) освободят его условно-досрочно – то есть могут освободить уже в будущем году. Но…

Сколько таких дел лежит в Следственном комитете? Не таких громких, но все-таки. Сколько папок с компроматом на высоких идеологов хранится в КГБ, в МВД, в Службе безопасности президента? Мы этого не знаем. Мы можем лишь догадываться об этом. И то – с трудом.

Система управления, построенная на систематическом и осознанном подавлении личности нижестоящего лица вышестоящим, неизбежно имеет в своем основании насилие над детьми. Только запугав ребенка, можно добиться его покорности тогда, когда он станет взрослым. Иначе он будет чувствовать себя свободным и, рано или поздно, потребует свободы во всем. Включая политическую и экономическую свободу.

Одна радость: растет непоротое, непуганное поколение, дети тех, кто воспитывался во времена Горбачева и затем, в первые годы суверенитета Беларуси. Их все больше. Но они – все-таки не большинство. Страх перед «взрослым дядькой с ремнем» транслируется куда успешней. И пример перед глазами: старших братьев пороли, поэтому нужно вести себя так, чтобы нас не тронули. Так они и живут.

Для таких даже рождение собственного ребенка может стать недоразумением – особенно если этот ребенок нежеланный, «по залету», как говорится. В борьбе за детскую нравственность в школах убрали даже намеки на сексуальное воспитание, оставив лишь формальную нагрузку на классного руководителя. Интернет и родители – вот кто задает матрицу поведения. И число неблагополучных (реально неблагополучных) семей вовсе не уменьшается. И та женщина, которая, едва родив, отнесла и оставила младенца в кустах, она – кто? Преступница? Жертва? Или не отдающий себе отчета в содеянном человек, у которого не было воспитано с детства представление о том, что такое жизнь и насколько она ценна.

Будет ли она плакать потом, когда сама повзрослеет? Психологически повзрослеет прежде всего. Когда поймет – если поймет вообще…

Впрочем, государство наше не требует понимания. Оно требует повиновения. Это совсем иное. И с этим ничего не поделаешь – хоть ты плачь.

КАДРЫ

Мацюшэўскі ўзначаліць Банк БелВЭБ



Былы першы віцэ-прэм'ер Васіль Мацюшэўскі абраны старшынёй праўлення Банка БелВЭБ. Цяперашні кіраўнік гэтай фінансавай структуры Мікалай Лузгін нядаўна прайшоў спецкамісію Нацбанка і атрымаў ухваленне на пасаду незалежнага дырэктара банка. Імаверна, ён увойдзе ў назіральную раду банка.

Галоўным акцыянерам ААТ «Банк БелВЭБ» з'яўляецца расійская дзяржкарпарацыя «Банк развития и внешнеэкономической деятельности (Внешэкономбанк)» – 97,52% акцый. Пасля прэзідэнцкіх выбараў у Расіі яе ўзначаліў былы першы віцэ-прэм'ер РФ Ігар Шувалаў.

РЭГІЁН

Зэльва стала энергетычна незалежнай

У раёне дабудавалі ветрапарк, які цалкам забяспечыць электраэнергіяй цэлы раён.

Побач з вёскай Холстава ўжо ўзведзены і пачалі працаваць шэсць ветракоў. Інвестыцыйны праект рэалізуецца з 2015 года паводле дамовы паміж Гродзенскім аблвыканкамам і ААТ «Зілант». На яго рэалізацыю былі скіраваны каля 3 мільёнаў еўра замежных інвестыцый.

Магутнасць аднаго генератара нямецкай вытворчасці – 1,65 МВт, вага аднаго ветрака – каля 200 тон, вышыня – амаль 70 метраў. Паводле ацэнак адмыслоўцаў, пры добрым ветры энергіі будзе выпрацоўвацца дастаткова, каб забяспечыць увесь Зэльвенскі раён, якому для ўласнага карыстання патрэбна 3 мегаваты. Спецыялісты сцвярджаюць, што ветрапарк акупіцца цягам пяці гадоў.

У свой час у Беларусі быў прыняты закон аб узнаўляльных крыніцах энергіі і створаны даволі прывабныя ўмовы для прыцягнення інвестыцый у гэтую сферу, што дало штуршок развіццю альтэрнатыўнай энергетыкі. Так, на тэрыторыі Гродзенскай вобласці некалькі гадоў таму запрацаваў ветрапарк у Навагрудскім раёне.

Многія інвестары пацягнуліся тады ў гэтую сферу, паколькі ўлады бралі на сябе адказнасць выкупляць электраэнергію, якая будзе выпрацоўвацца на гэтых аб'ектах, па павышаючых каэфіцыентах.

Цяпер жа ў сувязі з будаўніцтвам Беларускай атамнай станцыі ў Астраўцы многія эксперты звяртаюць увагу на тое, што апошнім часам беларускія ўлады ўзялі курс на тое, каб нейкім чынам адрэгуляваць гэтую сферу, і каэфіцыенты пры набыцці электраэнергіі, выпрацаванай на падобных крыніцах, становяцца менш прывабнымі. З запускам атамнай станцыі ў Беларусі ўзнікне прафіцыт электраэнергіі, а гэта значыць, што раней узяты курс на развіццё альтэрнатыўных крыніц энергіі будзе згортвацца.

Аляксей МІХАЛЁЎ.

СІТУАЦЫЯ

Мясцовае начальства баіцца агалоскі: раптам пачуе Лукашэнка!

Жыхары вёскі Капцёўка Гродзенскага раёна ўжо некалькі месяцаў вымушаны карыстацца іржавай вадой, якая да ўсяго мае непрыемны пах. У раённай жыллёва-камунальнай службе не могуць назваць тэрмін, калі вада ва ўсёй Капцёўцы стане прыдатнай для піцця. Вяскоўцы звярнуліся па дапамогу ў "Народную Волю".

З гісторыі пытання

У аграгарадку "Капцёўка" Гродзенскага раёна жывуць каля тысячы чалавек. Ёсць сярэдняя школа, дзіцячы садок, кавярня, некалькі аграсядзіб, крамы. Жыхары Капцёўкі распавядаюць, што праблемы з вадой у іх вёсцы пачаліся з канца вясны: яна згубіла сваю ранейшую якасць, памутнела, і ў яе з'явіўся вельмі непрыемны пах. Мясцовыя жыхары бачаць прычыну ў тым, што кіраўніцтва гаспадаркі вырашыла перадаць свідравіны, з якіх вядзецца забор вады, на баланс ЖКГ.

Дзве свідравіны, якія раней забяспечвалі Капцёўку, усё ж засталіся на балансе гаспадаркі, і вада з іх выкарыстоўвалася для патрэб калгаса і птушкафабрыкі. А дзве іншыя былі перададзены на баланс ЖКГ, вада з іх падавалася ў дамы вяскоўцаў, але ў адной са свідравін яна аказалася непрыдатнай для ўжывання людзьмі.

"Калгасныя каровы, як высветлілася, пачалі піць добрую ваду, а ў людзей з крана цякла іржавая і смярдзючая", – згадвае мясцовы жыхар **Мікалай Баўсюк.**

Пік гэтай праблемы прыйшоўся на сярэдзіну лета, калі стаяла спёка. Людзі, згубіўшы цярпенне, звярнуліся да СМІ і пачалі гучна патрабаваць, каб у іх дамах з кранаў цякла нармальная вада. На сустрэчу з жыхарамі Капцёўкі прыязджаў намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама **Уладзімір Дзяшко**, частымі гасцямі сталі супрацоўнікі санэпідэмстанцыі і рознага кшталту правяраючыя.

Высветлілася, што ў дамах жыхароў Капцёўкі з кранаў цячэ вада, у якой утрыманне жалеза ў 8 разоў перавышае норму, а колькасць нітратаў пры норме 45 мг/л складае 58,4 мг/л. Да ўсяго, на водаправодах адсутнічае сістэма водападрыхтоўкі. Людзі казалі намесніку старшыні аблвыканкама, што баяцца нават ногі мыць у такой вадзе, а не тое што яе піць.

На сустрэчы з Уладзімірам Дзяшко жыхары Капцёўкі патрабавалі, каб у іх хаты вярнулі ваду з тых свідравін, з якіх яна цякла доўгія гады. Быў аддадзены загад мясцовым кіраўнікам, і з кранаў ізноў пацякла вада, прыдатная для піцця.



Мікола Баўсюк паказвае, якая вада цячэ ў трубах ягонай хаты ў вёсцы Капцёўка.

Не мінула і месяца...

Праз месяц пасля таго, як начальства загадала падаваць жыхарам Капцёўкі ваду з "добрых" свідравін, у рэдакцыю "Народнай Волі" звярнуліся жыхары аграгарадка. Яны распавялі, што ў паловы вёскі зноў з кранаў пацякла іржавая вада з непрыемных пахам.

Пенсіянерка **Вацлава Паўлоўская** наліла ў адзін слоік ваду, якая цячэ ў яе доме з крана, а ў другі тую, што сын адмыслова набірае ў крынічцы, калі прыязджае з горада. Розніца бачна нават няўзброеным вокам.

– Мы жывём удваіх з мужам, – кажа спадарыня Вацлава. – *Ваду, якую падаюць нам у трубы, перакрылі. Сын раз на тыдзень прывозіць 60 літраў вады з крыніцы, ёю і карыстаемся. Мыць бялізну ў пральнай машыне вадой з крана таксама баімся, дачка забірае і мые ў горадзе.*

Сусед Паўлоўскай Мікалай Баўсюк напусціў вады ў ванну: знешне яна нагадвае хутчэй піва альбо віскі. Нават думкі не ўзнікае, што яе можна ўжываць у ежу альбо для мыцця посуду ці бялізны.

– Я тут неяк на падворку перабіраў бульбу, а потым абмыўся пад кранам у лазеньцы і выцерся ручнікам. Гляджу – ручнік стаў рудага колеру, – распавядае Мікалай. – *Пайшоў да суседзяў, а ў іх ува ўсіх такая ж сітуацыя. Цяпер гэтай вадой не карыстаемся. Пачысцілі студню, і вось набіраю з яе. А дзеці, калі з горада прыязджаюць, дык прывозяць бутляваную ваду, каб гатаваць на ёй ежу і піць.*

Тое ж на сваім падворку распавядае і пенсіянер **Іосіф Вашкевіч.** Кажа, што трубы перакрыў, а за вадой, як і многія аднавяскоўцы, ходзіць да крыніцы. З крыніцы ваду ніхто не правяраў.

– Да начальства скардзіцца больш не хадзілі, – кажа пенсіянер. – *А што хадзіць, ці ж яно што зменіць? Трэба самім нешта прыдумляць, аднаўляць студні.*

Мікола Баўсюк выказвае здагадку, што вады з "добрых" свідравін на ўсіх не хапае, таму палове вёскі яна паступае з "дрэнных".

– У нашай частцы вёскі дамы старыя і жывуць пераважна пенсіянеры, таму з намі так і абыходзяцца, – скардзіцца Баўсюк. – *У той палове жывуць маладзейшыя людзі, яны тады і на сходзе шмат крычалі, таму ім і баяцца адключаць добрую ваду. А што мы можам зрабіць?.. Паверылі мы тады начальніку з вобласці, а дарма...*

Пенсіянеры кажуць, што адзінае, на што ў іх хапіла сіл, звярнуцца ў "Народную Волю", бо, маўляў, начальства цяпер баіцца агалоскі, каб раптам пра гэта не пачуў Лукашэнка.

У амбулаторыі занепакоены сітуацыяй

Улетку, калі крызіс з вадой у Капцёўцы дайшоў да свайго піку, у амбулаторыю пачалі звяртацца мясцовыя жыхары са скаргамі на здароўе. **Уладзімір Бандарчук**, загадчык Капцёўскай амбулаторыі, распавёў, што да іх прыходзілі і дзеці, і дарослыя, і людзі пенсіённага веку са скаргамі на самаадчуванне.

– Мы тады ўзялі сітуацыю пад свой кантроль, тлумачылі людзям, каб ні ў якім выпадку не ўжывалі ваду з кранаў, – распавядае доктар. – *Я па некалькі разоў хадзіў і ў школу, і ў дзіцячы садок, выступаў, расказваў аб небяспецы карыстання іржавай вадой. Праўда, апошнім часам сітуацыя значна змянілася, людзей са скаргамі на тое, што яны дрэнна пачуваюцца ад таго, што папілі вады, не стала.*

Медыцынскіх работнікаў гэтая сітуацыя вельмі хвалюе: мясцовыя жыхары ў пераважнай большасці не купляюць бутляваную ваду, а бяруць яе з крыніц і студняў, якімі даўно не карысталіся.

– Нашы людзі не могуць купляць ваду ў крамах, паколькі гэта дорага для іх, – кажа жанчына, якая далучылася да нашай размовы. – *Ды і пажылым людзям прынесці дахаты бутлю вады з крамы цяжка.*

Адказу пакуль няма

Станцыю абезжалезвання вады, як высветлілася, у Капцёўцы павінны былі пабудаваць яшчэ ў 2008 годзе. Але, як гэта часта здараецца, у раённым бюджэце не знайшлося на гэта грошай. Сродкі пачалі тэрмінова шукаць пасля прыезду начальніка з аблвыканкама, калі іржавая вада ўжо лілася з труб.

Выконваючая абавязкі старшыні сельсавета **Таццяна Ласко** сказала "Народнай Волі", што праблемай займаецца раённая ЖКГ і там да яе ставяцца даволі сур'ёзна: маўляў, абяцалі ў лістападзе ўсталяваць новую станцыю абезжалезвання вады, што дазволіць закрыць гэтае пытанне.

Дырэктар ЖКГ Гродзенскага раёна **Васіль Кавальчук** на пытанне, калі ў Капцёўцы ўступіць у строй станцыя абезжалезвання, не стаў нічога тлумачыць "Народнай Волі". Ён спаслаўся на тое, што знаходзіцца на бальнічным, а калі вернецца на працу, то тады, маўляў, аб усім распавядзе ў тым ліку і чытачам нашай газеты.

Ягоны намеснік **Франц Якімовіч** адносна тэрмінаў запуску станцыі абезжалезвання нічога канкрэтнага сказаць не змог. Маўляў, праблема на стадыі вырашэння, але калі станцыя будзе запушчана, пакуль не вядома:

– Тое, што нехта нешта абяцаў, яшчэ нічога не значыць. Зараз вядзецца закупка абсталявання для станцыі, вырашаецца пытанне з памяшканнем. Усё ў працэсе...

Міхал КАРНЕВІЧ.
Гродзенскі раён.

СЛЫШАЛИ?

Ирина Хакамада впервые выступит в Минске

16 лет назад ее не впустили в Минск. Тогда Ирина Хакамада – один из ярчайших российских политиков – планировала выступить в белорусской столице со своим другом и соратником по партии Борисом Немцовым.

Вторая попытка обещает быть удачной. 10 ноября Хакамада выступит в роли бизнес-тренера в столичном Дворце спорта в рамках форума «Бизнес-Пробуждение 2.0», организованного при поддержке «Альфа-Банка».

Ирина Хакамада – кандидат экономических наук. Сегодня ее заслуженно вносят в число самых стильных и эффективных спикеров и экспертов по бизнес-переговорам, а книги Хакамады стали бестселлерами. В Минске она выступит с одним из наиболее ярких мастер-классов – «Айкидо деловых переговоров».



«Если есть результат, то ты – сильная личность; если, кроме разговоров, в сухом остатке не остается ничего – это свидетельство слабости. Принцип айкидо-переговоров заключается в том, что разговаривать нужно так, чтобы дать противнику проявить агрессию или слабость. До тех пор, пока он не показывает ни того, ни другого, добиться своей цели сложно», – утверждает Хакамада. Именно о том, как повлиять на эмоциональное состояние оппонента, распознать манипуляцию, защититься от психологического давления, расскажет Ирина минской аудитории.

«Составляя проект контракта (или внося поправки в контракт партнера), добавляйте позиции, которые вы готовы уступить, но прописывайте их очень ярко, очень жестко. Это ваши «красные слоны». Их вы обсуждаете и торгуетесь до беспредела. Это может длиться 2–3 часа, а потом вы их уступаете. И наоборот: то, что для вас важно, должно быть меленьким, спокойненьким и обсуждаться в конце как что-то незначительное. Так вы фактически обманули своего оппонента. Он, подписывая эту мелочь, будет радоваться, что «красных слонов» отбил. На самом деле это игра, которую вы подготовили», – и это один из приемов того самого айкидо деловых переговоров от Ирины Хакамады.

К СЛОВУ

Более 3000 бизнесменов

Ожидается, что участниками конференции станут более 3000 бизнесменов из Беларуси и стран ближнего зарубежья. Хакамада – не единственный звездный гость мероприятия. Организаторы заявляют, что с мастер-классом «Путь от идеи к миллиарду» на «Пробуждении 2.0» выступит мультимиллионер **Оскар Хартманн** – 35-летний бизнесмен, основатель более 10 компаний с общей капитализацией свыше 5 млрд долларов и личным состоянием около 300 млн долларов. Также в число топ-спикеров форума войдут основатель «Бизнес молодости» **Михаил Дашкиев,** основатель самого крупного в СНГ сообщества интернет-предпринимателей Genius Marketing **Олесь Тимофеев** и основатель компании #Grebenuk Resulting, эксперт по продажам и автор самого дорогого и востребованного в РФ курса «Реальный отдел продаж» **Михаил Гребенюк.** Все спикеры выступят в Беларуси впервые.

100 РАДКОЎ

Міхася СКОБЛЫ



Чаму Максім Кароткін лічыць чытачоў дурнямі?

Чарговым разам заехаўшы ў вёску да маці, я застаў яе як ніколі самотнай і разгубленай. Прычына высветлілася хутка – замоўк радыёпрыёмнік "Сож", які рэдка калі выключаўся. Ужо 32 гады маці жыве адна, і той "Сож" быў для яе і крыніцай навін, і паказчыкам, што жыццё недзе працягваецца, і адзіным суразмоўцам у абязлюднелай вёсцы.

Тэлевізар маці глядзець не любіць ("абы-што паказваюць"), а вось радыё слухала з задавальненнем – там і песні даўнейшыя гучалі, і набажэнствы на роднай мове перадаваліся, і дзеці сваіх бацькоў з юбілеямі віншавалі. Грэла матчыну душу і тое, што радыё было пераважна беларускамоўнае, гаварыла "па-нашаму".

І вось яно змоўкла. Не навальніца парвала правады, не сапсаваўся старэнькі прыёмнік. Проста нейкі начальнік над тэлеграфнымі слупамі ў Мінску вырашыў, што адзінокім старым па ўсёй Беларусі слухаць праваднае радыё – залішняя раскоша, вялікія выдаткі нясе дзяржава, няхай купляюць прыёмнікі на батарэйках. І – адключыў рубільнік.

Падобная сітуацыя надзвычай пранікліва апісана ў вершы Анатоля Вярцінскага "Дынамік", гераіня якога гаворыць: "*Дзе сыны? Няма нікога. / Толькі радзіва адно. / Толькі радзіва – мне падмога. / Што б рабіла, каб не яно? / І пагаворыць, і паспявае, / Добрай ночы жадае мне. / І паплачам з ім, бывае, / Як успомнім аб вайне*".

Апеты паэтам сапсаваны дынамік парамантаваў – на ўцеху бабулі – сусед, "радзіст Косця". А да каго звярнуцца тысячам беларускіх бабуль і дзядуль у закінутых вёсках, дзе адзінай жывой сувяззю з навакольным светам стала аўталаўка? Калі ў правадах не стала напружання, а сям-там ужо і правады зніклі, хто дапаможа?

Адабраўшы ў пенсіянераў роднае праваднае радыё, што наша клапатлівая дзяржава ім пакінула? Рускамоўныя АНТ і Першы канал БТ (не заўсёды беларускамоўны "Беларусь-3" ідзе далёка не паўсюль), і – усе расійскія федэральныя каналы. Ледзь не штодзённымі гасцямі ў беларускіх вясковых хатах сталі расійскія тэлешоўмены Малахаў з Салаўёвым: адзін забаўляе меладрамамі, другі напорыста прапіхвае ў галовы гледачоў імперскую палітыку.

Не адзін Гаўрыла ў Полацку, не адна тэлескрыня гаспадаром у хаце – скажаце вы. Ёсць жа, напрыклад, мясцовая прэса, якую спраўна развозяць матарызаваныя паштальёнкі. Так, раённыя газеты па-ранейшаму – асноўнае чытво на вёсцы. І сёй-той нават цешыцца з іхняй "дэкамунізацыі": было "Ленинское знамя" – стала "Воранаўская газета", была раёнка "За камунізм" – стала "Бераставіцкая газета", была "Чырвоная звязда" – стала "Янаўскі край", было "Знамя Октября" – стала "Наш час"...

Але ва ўсіх гэтых беларускіх – паводле назваў – газетах беларуская мова, як бедны сваячок, туліцца ў парозе, ёй няма ходу ў святліцу, дзе гаспадарыць мова руская. Усе галоўныя па тэматыцы артыкулы – па-руску, па-беларуску часам анекдоцік ці парады, калі сеяць агуркі.

Не адстаюць ад раёнак у справе русіфікацыі і абласныя газеты. Вось я гартаю ў бібліятэцы падшыўку "Мінскай праўды". Нумар за 17 жніўня – ніводнага артыкула па-беларуску. Нумар за 12 кастрычніка – ніводнага. І гэта на 16 палосах! Нумар за 20 красавіка – два артыкулы на мове. Сярод 40 (!) рускамоўных. У гэтым нумары маю ўвагу сваёй "трасяначнай" назвай прыцягнуў рэпартаж "Максимова криничка", з якога я даведаўся, што, аказваецца, пітную ваду для расійскай імператрыцы Кацярыны ў Пецярбург вазілі ажно... з-пад Крупак. За васямсот кіламетраў. Коннымі вадавозамі.

Ну як на цвярозую галаву можна такое дурноцце чаўпці? У друк падпісваць? Ну чаму мы гэткія падкія да ўсяго чужога? Знойдзем і там, дзе яно ніколі не ляжала.

Галоўны рэдактар "Мінскай праўды" **Максім Кароткін**, чаму вы лічыце чытачоў дурнямі? І хто вам даў права ў дзяржаўным выданні паслядоўна, з нумара ў нумар, ігнараваць дзяржаўную беларускую мову?

Пагрэбшыся на антрэсолях, я ўсё ж адшукаў для маці радыёпрыёмнік "Гародня", які дастае чатыры праграмы са звычайнай электрасеткі. Але ні на якіх "антрэсолях" другой абласной газеты – на роднай мове – не знайсці. І русіфікуюцца паступова жыхары спрадвечна беларускіх Случчыны і Любаншчыны, Маладзечаншчыны і Лагойшчыны, Дукоры і Плешчаніцаў...

Рэдактарам мясцовых газет ды іх заснавальнікам яўна бракуе дзяржаўнага светапогляду, якім здзівіў мяне неяк знаёмы пісьменнік, папрасіўшы перакласці з рускай на беларускую мову яго дзіцячую кнігу. Я машынальна запытаўся ў яго, рускамоўнага і ў побыце, і за пісьмовым сталом: навошта гэта табе? І пачуў адказ: хай для ўнукаў застанецца.

Гэта значыць, яшчэ даволі малайцаваты дзядуля, які ўсё жыццё гаварыў па-руску, напісаў па-руску дзясяткі два кніжак, у напалову зрусіфікаванай Беларусі дзіўным чынам упэўнены, што ягоныя ўнукі будуць чытаць і размаўляць па-беларуску!

Прызнаюся: я быў уражаны, але не падаў выгляду. Маўляў, так і павінна быць. Толькі працытаваў свайму знаёмцу Купалу: *"К свабодзе, роўнасці і знанню / Мы працярэбім сабе след, / І будзе ўнукаў панаванне..."* Я наўмысна "забыўся" апошні радок гэтага вядомага чатырохрадкоўя, бо дзед зусім не плакаў, а прыехаў на сустрэчу на даволі прэзентабельным аўто.

І ўсё ж дзіўнаватае адчуванне мяне тады доўга не пакідала. Далёка не аднадумцы ў дні сённяшнім, мы цалкам сыходзіліся ў бачанні беларускай будучыні. І ў той будучыні нам аднолькава бачылася наша краіна. Беларускамоўная Беларусь. Умацаваная адзінай мовай.

А пакуль яна, падточаная русіфікацыяй, слабее. І будзе слабець, пакуль над беларускімі хатамі бесперашкодна пікіруе кіраваны з Астанкінскай вежы знішчальнік – пасланец гібрыднай вайны. Як у вядомай песні Высоцкага, ён зверху раве "Мир-р вашему дому", але мы ведаем, што чакаць міру ад яго беларусам не выпадае.

ДЫСКУСІЯ

АД РЭДАКЦЫІ

25 верасня ў "Народнай Волі" была апублікавана чарговая калонка Міхася Скоблы пад назвай "Шашаль мовы – трасянка". Аўтар і рэдакцыя разлічвалі на пэўны рэзананс, але не на такі, які атрымалі. Хто б мог падумаць, што на гэтым матэрыяле былы старшыня ГА «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" Алег Трусаў, вобразна кажучы, вырашыць папіярыцца. Яго выказванні на адрас М.Скоблы адразу ж з'явіліся ў розных сродках масавай інфармацыі.

Паколькі з шэрагам сцвярджэнняў спадара Трусава нельга пагадзіцца, то "Народная Воля" вырашыла іх надрукаваць з каментарыямі аўтара артыкула "Шашаль мовы – трасянка".

Крыху пра трасянку

Харошы дзядзька Міхась Скобла. Разумны, прыгожы, дасціпны, вершы піша, у розных газетах друкуецца, падабаецца жанчынам і дзецям. Нядаўна ў "Народнай Волі" (гл. №76 ад 25 верасня) чарговы артыкул напісаў, аж цэлых 100 радкоў, і назву цікавую прыдумаў "Шашаль мовы – трасянка". Палымяны публіцыст, сп.Міхась выступіў у абарону роднай мовы ў яе найчысцейшым варыянце, праўда, не сказаўшы, які з існуючых яе варыянтаў яму даспадобы, "тарашкевіца" ці "наркамаўка". Прамаўчаў і пра ўлюбёны алфавіт, бо іх у нас два – "кірыліца" і "лацінка".

Прааналізаваўшы мову артыкула сп.Скоблы, сціпла назавём яе *скаблянка*, тым больш што *трусянка* ўжо ёсць. Спадзяюся, што ў яго пярэчанняў з гэтай нагоды не будзе. Шырокае кола носьбітаў трасянкі абмаляваў "народаволец" дзядзька Міхась. Гэта экскурсаводы розных музеяў, аўтары прыдарожных шыльдаў, вядомыя спевакі і гумарысты і асабліва маладыя паэты. Трапіў у гэты ганаровы шэраг і я. Праўда, песні і вершы я не пішу і спеўнага таленту не маю, але – былы старшыня ТБМ і, самае галоўнае, амаль рэктар і "цяперашні арганізатар Нацыянальнага ўніверсітэта".

Можа, тут якраз і "закапаны сабака", бо хто толькі зараз на мяне не нападае з нагоды заснавання і дзейнасці ўніверсітэта з беларускай мовай навучання! Вось і Міхась Скобла далучыўся да такіх дзяржаўных выданняў, як "СБ" і "Лідская газета", незалежнага сайта ЗБС "Бацькаўшчына", выпускнікоў ЕГУ і іншых змагароў за дэмакратыю і справядлівасць.

Але з гісторыяй у сп.Міхася ёсць крыху праблем. Так, ён піша, што трасянка "далася беларусам у знакі яшчэ на самым пачатку сталінскага тэрору". Не, шаноўны сп.Скобла, з'явілася яна ў нас значна раней, яшчэ ў XVII стагоддзі, у часы Рэчы Паспалітай, і была яна польска-беларускай, прычым ахапіла спярша нашых магнатаў і шляхту. Дастаткова прыгадаць знакамітую "Прамову Мялешкі". Але, размаўляючы па-польску, наша эліта пра трасянку не забывалася, за што ёй вялікі дзякуй. Напрыклад, наш зямляк Адам Міцкевіч уключыў у свае творы столькі беларускіх слоў, што палякі зараз цэлыя дысертацыі пішуць на гэтую тэму накшталт "Беларусізмы ў творах Адама Міцкевіча". Ды і наш класік Янка Купала трасянкі не цураўся, прычым карыстаўся яе двума варыянтамі – як польска-беларускім, так і беларуска-рускім. Дарэчы, і свае першыя вершы спрабаваў пісаць па-польску.

У савецкія часы беларуская трасянка жорстка выкаранялася, асабліва ў войску. Дастаткова вясковаму беларусу сказаць некалькі родных слоўцаў альбо прамаўляць рускія словы на свой капыл, адразу чуліся кпіны і здзекі з боку "таварышчаў афіцэраў".

Таму трасянка ў нас зараз не шашаль, а апошні бастыён абароны перад шалёным наступам "русского мира".

Напрыклад, прыедзе ў Маскву вядомы нам усім беларус, прачытае па паперцы прамову на "великом и могучем", а потым адкладзе яе ўбок і скажа толькі адно слова *гвалт* – і ўсё, ён ужо не "рускі са знакам якасці".

Вялікую ролю носьбіты трасянкі, а гэта большасць насельніцтва Беларусі, могуць адыграць у наступным годзе, падчас чарговага перапісу насельніцтва.

Я заклікаю ўсіх, хто яшчэ не перайшоў канчаткова на літаратурную мову суседняй дзяржавы, ва ўсіх графах падпіснога ліста пісаць толькі адну мову – беларускую.

Хай трасянка замацуе нашу незалежнасць, а потым, калі па-беларуску загаворыць наша ўлада, можна спакойна, без вялікага ўціску і гвалту засвоіць і "скаблянку".

Алег ТРУСАЎ,
ганаровы старшыня ТБМ,
в.а. рэктара Універсітэта імя Ніла Гілевіча.

КАМЕНТАРЫЙ

Траянскі конь русіфікацыі

Шаноўны Алег Трусаў пачаў свой водгук з кампліментаў на мой адрас, а я пачну з віншавання. І павіншую свайго апанента з тым, што прапагандаваная ім з дзіўнай настойлівасцю трасянка вылезла ўжо і на тэатральную сцэну. Літаральна сёння, едучы ў метро, пабачыў я рэкламную абвестку Маладзёвага тэатра эстрады. Аказваецца, у яго рэпертуары нядаўна з'явіўся спектакль на руска-беларускай трасянцы "Мікітаў лапаць – рукамі не лапаць". Відаць, яго стваральнікі спадзяюцца такім чынам дамагчыся большых касавых збораў.

У сваім лісце Алег Трусаў апелюе да імёнаў класікаў – Адама Міцкевіча і Янкі Купалы. Маўляў, і яны не цураліся трасянкі. Але ж гэта не так. Шляхотны паэт Міцкевіч ніколі не пісаў на трасянцы, ён проста выкарыстоўваў беларусізмы ў сваіх творах. І яны там, трэба сказаць, натуральна глядзеліся. Як, скажам, натуральна выглядаюць у беларускай мове германізмы *шыба, цукар, цуглі* альбо літуанізмы *рэзгіны, сцірта, атосы*. Любая мова мае безліч пазычанняў, яны прыжываюцца, і часам амаль немагчыма вызначыць, адкуль тое ці іншае слова паходзіць.

Так што ў нашай сітуацыі Міцкевіч у саюзнікі Трусаву зусім не падыходзіць. Як і Купала. Так, ён выкарыстоўваў трасянку – хто не памятае тэмпераментных маналогаў Мікіты Зноска з "Тутэйшых" у геніяльным выкананні Віктара Манаева? Усе гэтыя *"между протчым"*, *"радуйся, усяленная"* ды *"гута моргэн, гэр германіш"*. Але Купала ўжываў трасянку з адной мэтай – паказаць у непрыглядным святле прыстасаванца Мікіту, які ў залежнасці ад "палітычнай сытуацыі" са Зноска ператвараецца то ў *Нікіція Зносілова*, то ў *Нікіціуша Зносіловского*. Так што і Купалу прыпісваць сабе ў саюзнікі мой апанент яўна паспяшаўся.

Дзіўна, што спадар Трусаў "адкопвае сабаку" там, дзе яго ніхто не закопваў. Маўляў, я, крытыкуючы яго за падтрымку трасянкі, станаўлюся ў адзін шэраг з "Советской Белоруссией" і "выпускнікамі ЕГУ", якія нападаюць на майго візаві за спробу стварыць Нацыянальны ўніверсітэт. Але ў маіх "100 радках" няма ні слова крытыкі таго ўніверсітэта, хоць я і лічу яго будаваннем хаты з коміна. Ну што ж, калі не даюць узвесці сцены, можа, варта і з коміна пачынаць…

Дарэчы, будучы Нацыянальны ўніверсітэт названы імем Ніла Гілевіча, які катэгарычна не прымаў трасянку, называў яе "пачварнай з'явай, пераходнай ступенню да поўнай ліквідацыі беларускай мовы". Ніл Сымонавіч выкарыстоўваў трасянку (як і Купала) выключна ў сатырычных мэтах. Памятаеце, як пацешна выглядае герой рамана "Родныя дзеці", калі ў сямейным застоллі віншуе "мамашу" на трасянцы? *"У ту вужасную разруху, / Благадара і вапракі, / Ана не пала сілай духу, / Пускала нас, как пціц, з рукі".*

Гісторыку Алегу Трусаву падаецца, што я дрэнна вывучаў гісторыю, бо не ведаю, што гэтак мілая яму трасянка з'явілася яшчэ ў XVII стагоддзі. Праўда, тады яна была беларуска-польскай. Усё так. Але, пагадзіцеся, *з'явілася* і *далася ў знакі* – не адно і тое ж. Трасянка і сёння нам даецца ў знакі – у тым ліку і на прыдарожных знаках. Вёска *Круляўшчызна* пад Мінскам – няўжо гэта пераручаная (крычма крычыць!) назва лашчыць слых спадару Трусаву?

Трасянка – ніякі не "бастыён абароны перад наступам "русского мира". Гэта яго давераная асоба, траянскі конь русіфікацыі, і цягнуць яго на беларускі падворак безадказна і небяспечна. Гэта добра разумеў і папярэднік Алега Трусава на пасадзе старшыні Таварыства беларускай мовы мудры Генадзь Бураўкін, які свае адносіны да трасяначнікаў сфармуляваў проста афарыстычна: *"Перажыла наша родная мова / і Бенкендорфа, і Мураўёва, / панскія здзекі, чэкісцкія чысткі, / рогат імперскі, вырак фашысцкі… / Тых, што з трасянкаю ў галаве, / перажыве!"*

А за "скаблянку", вядома ж, дзякуй! Толькі наватвор гэты абсалютна беспадстаўны, ён не прыжывецца. Беларускай мове падобныя прыдумкі зусім не патрэбныя. Ёй бы з накінутымі з розных бакоў "пабедамі" і "круляўшчызнамі" справіцца.

Міхась СКОБЛА.

НЕ МАГУ МАЎЧАЦЬ!

Не чапляцца за ўчарашні дзень

Дасюль старэйшыя людзі настальгуюць па СССР настолькі моцна, што кідаюцца ў бойку, адстойваючы свае палітычныя погляды. Той, хто стаіць за незалежнасць і суверэнітэт Беларусі, для іх НАЦЫЯНАЛІСТ, НАЦЫСТ, а значыць, ФАШЫСТ.

Так, наша грамадства вельмі палітызавана, але ўсе хочуць "трошкі больш грошай". У камуністычнай сацыяльнай палітыцы не існуе механізму, які можа гэтае "трошкі" чалавеку даць. Гэты механізм нам, простым людзям, і трэба збудаваць, патрабуючы ад улады выканаць Пастанову Міністэрства працы і сацабароны №62 ад 19 ліпеня 2018 года, якой зацверджаны МІНІМАЛЬНЫ СПАЖЫВЕЦКІ БЮДЖЭТ для кожнага, хто жыве ў Беларусі, акрамя беспрацоўных.

У гэтай пастанове вызначаны і зацверджаны мінімальныя сацыяльныя гарантыі кожнаму беларускаму дзіцяці ад нараджэння да паўналецця. І калі мы, бацькі, запатрабуем ад улады выканання гэтай пастановы, мы тым самым здзейснім высокамаральны грамадзянскі ўчынак, перастанем быць маўклівымі рабамі, пачнём людзьмі звацца.

На трэці квартал 2018 года для дзецей зацверджаны наступныя месячныя мінімальныя спажывецкія бюджэты:

да трох гадоў – 279,56 рубля,

ад трох да шасці гадоў – 367,48,

ад шасці да 18 гадоў – 377,43 рубля.

Для многіх гэта амаль сённяшні заробак, таму нярэдка непасрэдна сям'я не мае магчымасці столькі выдаткоўваць на кожнае дзіця. Таму давайце не вяртацца ў мінулыя часы, а думаць, як сёння палепшыць жыццё. І сваё, і сваіх дзяцей. А ўлады павінны выконваць свае пастановы. Зацверджаны мінімальныя спажывецкія бюджэты – калі ласка, стварыце такія ўмовы, каб кожная сям'я мела прыстойныя даходы.

Валерый ГАРБАЦЭВІЧ.
Салігорск.

ХОТИТЕ ЗНАТЬ...

Встретил на днях друга, а он говорит: «Знаю, ты теперь шабашничаешь, так вот не вздумай брать у хозяина валюту – подзалетишь так, что можешь все потерять…»

«Народная Воля», объясни, в чем дело. Что, я, строитель, действительно не имею права получать от заказчика валюту?

Вячеслав КОНЦЕВОЙ.

Получил за работу валюту – готовься к конфискации и штрафу




Уважаемый Вячеслав!

Вы, оказывается, не знакомы с Указом президента №49 от 9 февраля 2015 г. «О порядке при осуществлении валютных операций». В нем четко сказано: лица, принявшие иностранную валюту в качестве платежного средства за выполненную работу или оказанные услуги, привлекаются к ответственности в виде штрафа размером от 50 до 100 базовых величин, что равняется 1225–2450 рублям. К тому же конфискуется предмет сделки, полученная валюта, обнаруженная у виновного лица в момент совершения сделки.

Так что, дорогой читатель, имейте это в виду и, чтобы избежать наказания, требуйте от заказчика плату за выполненную работу в белорусских рублях.

МАЛАЯ РАДЗІМА



Кастусь ЦВІРКА

У Зялёнай Дуброве

(Працяг. Пачатак у №82.)

***

Вельмі добрую завядзёнку прыдумалі нашы ўлады: перыядычна наладжваць сустрэчы раённага кіраўніцтва з людзьмі кожнай вёскі. Там усе могуць выказаць свае пажаданні ці прэтэнзіі да кіраўнічых асоб. На адной такой сустрэчы-сходцы ў Зялёнай Дуброве выступіў і я – пра засмечванне нашых ваколіц. Каб "завастрыць пытанне", сказаў, што з часам у грыбы трэба будзе хадзіць не толькі з кошыкам, але і з граблямі: каб адграбаць пластыкавыя бутэлькі і ўсякае панакіданае там смецце. Тагачасны старшыня нашага райвыканкама Васіль Усік тут жа даў каманду сваім падначаленым ліквідаваць усе міні-звалкі каля вёскі і наладзіць тут сістэматычны збор смецця. Сказана – зроблена. І от цяпер кожную сераду праязджае па вёсцы жоўты смеццявоз і адвозіць усе нашы "адходы". Цяпер ізноў з прыемнасцю можна будзе хадзіць у лес.

***

Як люба слухаць мне гаворку маіх суседзяў – Вікціных дзяцей і ўнукаў, што кожныя выхадныя і ў водпускі з'язджаюцца з Мінска "дадому". Усе яны, услед за самой Вікцяй, гавораць на чыстай беларускай мове, мове сваёй зямлі. Ды от дзіва: калі, бывае, сустракаю іх у Мінску, яны ўсяляк пнуцца "русіць", сыплючы "перламі" нашай знакамітай трасянкі. Гэтак мы, беларусы, падладжваючыся пад чужаземшчыну, дагаджаючы прыхадням і сваім адшчапенцам, і ломім свой язык, ломім сябе.

***

Завіталі госці – школьнікі са Старых Дарог. Цікаўная, дапытлівая моладзь, пераважна старшакласнікі. Але калі я паказваў ім свой "прыватны" этнаграфічны музей, яны моцна мяне расчаравалі.

– Ну, адкажыце: што гэта? – пытаюся, паказваючы на кросны.

– Ткацкий станок, – адказваюць.

На спрадвечныя вясковыя калёсы кажуць – "телега", на прасніцу – "прялка", на жорны – "жернова".

Многія рэчы нядаўняга сялянскага быту зусім назваць не могуць. Вот падвёў іх да ярма на сцяне.

– Што гэта?

Маўчаць, паціскаюць плячыма. Толькі адзін з іх нясмела выказвае здагадку:

– В это впрягали лошадь.

– Для коней меўся хамут, – тлумачу, – а гэта – ярмо. Для каго яно прызначалася?

– Может, для быка?..

– Не для быка, а для вала, – растлумачваю.

– А что такое "вол"? – пытаюцца.

Мусіў адказаць:

– Гэта бык, толькі лягчаны.

– А што такое –"лягчаны"?

Давялося адказаць, хоць былі тут і дзяўчаткі, вельмі "папулярна":

– Бык, якому выразалі яйцы.

У 1950-х гадах, калі я вучыўся ў Старых Дарогах, тут усюды гучала свая, беларуская мова. Гучыць яна, хоць радзей, і сёння. А ў школах, як цяпер убачыў, не толькі не вучаць па-належнаму роднаму мову, а, наадварот, адвучваюць ад яе. Робяць беларусаў чужынцамі на сваёй зямлі.

***

У электрычцы, якой ехаў у Мінск здаваць у друк чарговую кнігу "Беларускага кнігазбору", пачуў у суседнім купэ-адсеку гаворку пажылых жанчын. Адна з іх так казала сваім кампаньёнкам: "Была я на Украіне – усе там гавораць па-свойму, па-ўкраінску. Адны мы, лапавухія беларусы, цураемся сваёй мовы".

***

Слухаў па Радыё Свабода выступленне экс-прэзідэнта Украіны Леаніда Кучмы, які казаў: "Саюз з Расіяй – гібель для Украіны". А для Беларусі?

***

Блукаючы па лесе, натрапіў на Корзунаву дзялянку. Калі наш сусед Коля Корзун быў лесніком, яму выдзелілі яе для сенакосу. Гэта была для яго "свая зямля", свой куточак волі сярод калгаснага прыгону. Ды не доўга ім цешыўся: памёр маладым. Загубіў яго той жа бесчалавечны Ахіпелаг ГУЛАГ, у які быў закінуты ў 1930-х гадах яго бацька. Толькі бацька апынуўся там, за калючым дротам сталінскага канцлагера як "вораг народа", як зэк, а сын як канваір гэтакіх зэкаў, сярод якіх ён мог сустрэць і канваіраваць і роднага бацьку, – такую адбываў Коля вайсковую службу. У тым лагеры, расказваў ён, не толькі зэкам, а і іхнім канваірам у моцныя маразы часта не ставала добрага абутку, і Коля вельмі застудзіў там ногі, ад чаго атрымаў невылечную хваробу, якая і звяла яго ў магілу.

***

